**СПРАВЯДЛІВАСЦЬ,**
**МІЛАСЭРДНАСЦЬ,**
**ЕДНАСЦЬ**

# 1989 г. 1999 г.

## 17 ліпеня

# 10 год

# Бабруйскай арганізацыі ахвяр палітычных рэпрэсій

*Наш адрас:* **213826, г. Бабруйск,**
**вул. Чангарскага д.81/25 кв. 2**
**тэл / факс ( 375 - 02251 ) 6-89-95**
**расчетный счет №3015205540014**
**валютный счет №30152055450019 в**
**отделении Белбизнесбанка г. Бобруйска,**
**код 153801721**
БУТ д. 6131



29 красавіка 1995 г. пры арганізацыі адкрыты першы ў былым Саюзе музэй Памяці ахвяр палітычных рэпрэсій. Адным з цэнтральных месц у музэі займае страшэнная сваёй нагляднасцю карта ГУЛАГу, на якой зазначана звыш пятьсот аб'ектаў - лагераў і лагерных пунктаў. Некалькі насценных стэндаў з фотаздымкамі расказваюць аб замардаваных ахвярах палітычных рэпрэсій. Частка экспазіцыі аддадзена пад дакументальныя матэрыялы, тварыўшыхся ў сталінскі перыяд беззаконняў: у напольных вітрынах прадстаўлены розныя пасведчанні, ваенныя білеты ( на адным з іх засталіся сляды крыві рэпрэсаванага); выпіскі з пастанаўленняў судовых устаноў і камісій па рэабілітацыі, выразкі з газэт, кнігі, у якіх змешчана інфармацыя аб рэпрэсіях; цудам захаваўшыяся асабістыя рэчы зняволеных г.д. Шэраг матэрыялаў прысвечаных






**У музэй, бяда сабрана дзе людская,**
**Зайдзі з журбою, чэсны чалавек,**
**Няхай гадзіна гэтая ліхая,**
**Не прыйдзе зноў, і знікне хай навек!**





мерапрыемствам, якія праводзіла Бабруйская арганізацыя ахвяр палітычных рэпрэсій у памяць аб бязвінна забітых і закатаваных у турмах і лагерах камуністычнага рэжыму людзях. Цяпер тут можна атрымаць дакладныя ўяўленні аб сапраўдных маштабах сталінскіх рэпрэсій. У бліжэйшы час плануецца разшырэнне экспазыцыі музэя.

Дзверы музэя адчынены для ўсіх. Яго наведваюць школьнікі, студэнты – групамі і па аднаму, госці горада і, безумоўна, сем'і членаў нашай арганізацыі. На сёняшні дзень музэй наведала больш за 9 тысяч чалавек. Некаторыя з іх пакінулі свае водгукі ў кнізе"Ганаровых гасцей". Вось адно з іх: " Забыццё гісторыі небяспечна, яно прывядзе да няведання ісціны." (Пратаірэй Фёдар Поўны).





Бабруйская арганізацыя ахвяр палітычных рэпрэсій была створана ў 1989 г. Гэта першае аб'яднанне такога накірунку ня толькі ў Р.Беларусі, але і ў былым Саюзе. Яна з'яўляецца неўрадавай, праваабарончай, некамерцыйнай арганізацыяй. Мае свой Статут, карыстаецца правам юрыдычнай асобы.

У яе склад уваходзяць: самі рэпрэсаваныя, якія прайшлі пекла ГУЛАГу, удовы расстраляных і закатаваных, дзеці "ворагаў народа", якія нават ня ведаюць месца пахавання сваіх бацькоў.

Яна аб'ядноўвае тры арганизацыі: Ленінскую, Першамайскую, Бабруйскую раённую.











Зараз у ей налічваецца каля 2000 чалавек. Пры дапамозе арганізацыі сотні людзей атрымалі даведкі аб рэабілітацыі, дакумэнты і фотаздымкі з архіваў КДБ, кампенсацыю за маёмасць,пасведчанні аб смерці і апошніх днях жыцця. З жніўня 1996 г. па жнівень 1998 г. выдаваўся незалежны бюлетэнь «Інформ-Центр», адзінае выданне ў РБ па праблемах палітрэпрэсаваных.

Пры арганізацыі створана бібліятэка прававой літаратуры, архіў, спісы расстрэляных на 10000 чалавек, сабраны гістарычны матэрыял з успамінаў ахвяр для кнігі Памяць.

Зняты чатыры відэафільмы аб жыцці і дзейнасці арганізацыі.

Было праведзена 7 вечароў Памяці, 9 мітынгаў –рэквіемаў, 12 круглых сталоў па правах чалавека. 10 лістапада 1998 г. адкрыты клуб "Сустрэч , Памяці і болю..." У помніка ахвярам палітычных рэпрэсій на плошчы Перамогі заложаны сквер Памяці. Кожны год праводзяцца дабрачынныя акцыі "З рук у рукі" па збору рэчаў збяднелым людзям.

У 1997 г. на прыёме пабывала – 3842 чалавекі, а ў 1998 г. – 3917 чалавек. У першай палове 1999 г. - 1280 чалавек.




**Галоўнымі мэтамі арганізацыі з'яўляюцца:**

- аказанне прававой, сацыяльна–бытавой і іншай дапамогі;
- садеянне поўнай і галоснай рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій;
- аднаўленне гістарычнай праўды аб ахвярах палітычных рэпрэсій;
- вызначэнне месцаў пахавання, збудаванне помнікаў, стварэнне кніг Памяці;
- адкрыццё Рэспубліканскага неўрадавага інфармацыйнага Цэнтра па аказанню прававой дапамогі грамадзянам РБ, пацярпеўшым ад палітычных рэпрэсій;
- выдаць рэспубліканскую кнігу Памяці «Мы з ГУЛАГу».